PolotskSU



УДК 303.446.4(=161.3)(475.5)“18/20”=161.3

# ДА ПЫТАННЯ ЭТНІЧНАЙ ІДЭНТЫЧНАСЦІ БЕЛАРУСКАЙ СУПОЛЬНАСЦІ Ў ЛІТВЕ НА ПРЫКЛАДЗЕ ДУХОЎНАЙ КУЛЬТУРЫ

*А. ІЗЕРГІНА*
Цэнтр даследванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі

*Этнічная ідэнтычнасць - дынамічны працэс, які можа падвяргацца шматлікім трансфармацыям. Аўтар прыходзіць да высновы, што ў эпоху глабалізацыі “ідэнтычнасць” і галоўныя тэндэнцыі ў развіцці этнічнай ідэнтычнасці беларусаў Літвы з’яўляецца прадметам выбару, характарызуюцца зменлівасцю, рухомасцю, множнасцю.Згодна палявых матэрыялаў (сабраных аўтарам на працягу 2015-2017 гг. на тэрыторыі Літоўскай Рэсрублікі), аўтар прыходзіцьда высновы, што хоць развіццё глабалізацыі не прыводзіць да сцірання этнічных адрозненняў, але этнічная ідэнтычнасць, як форма групавой ідэі зведвае сур’ёзныя змены, як у бок гіпербалізацыі, так і змяншэння. Этнанацыянальныя ідэалогіі, захаванне і распрацоўкі творчай элітай вобразаў мінулага спрыяюць кансалідацыі беларускай супольнасці і фарміраванню этнічнай ідэнтычнасці розных узроўняў.*

Пераўтварэнні, якія адбыліся ва ўсіх сферах беларускага грамадства за апошнія 25 гадоў, паўплывалі і напрацэс станаўлення духоўнай культуры беларусаў замежжа. Пачатак XXI ст. у глабальным сэнсе стаў не толькі часам трансфармацыі базавых сацыяльных інстытутаў і новай сацыяльнай дыферэнцыяцыі, але і перыядам сур’ёзных змен у культурным жыцці беларускай дыяспары. Змены сацыяльных умоў, змена грамадскіх каштоўнасных арыенціраў прывялі да таго, што традыцыйны механізм ўзнаўлення каштоўнасных падстаў этнакультуры перастае быць вядучым, саступаючы месца новым, мадэрнізаваным і глабалізаваным адаптацыйным механізмам. У гэтых умовах сталі вельмі актуальнымі пытанні суадносін духоўнай культуры і нацыянальнай самасвядомасці беларусаў замежжа.

На тэрыторыі былога Савецкага Саюза са спыненнем існавання гэтай дзяржавы адбыўся працэс вылучэння малых этнічных груп як асобных сацыяльна-структурных адзінак, у адносінах да якіх ужывацца тэрмін “дыспара”. Словам “дыяспара” (з грэчаскай мовы – рассяленне) у навуковай літаратуры прынята называць сукупнасць пэўнага народа, якая пражывае па-за межамі метраполіі і валодае асноўнымі рысамі нацыянальнай адметнасці народу – мовай, культурай, самасвядомасцю. Тэрмін “беларуская дыяспара” пачаў актыўна ўжывацца ў навуковых даследаваннях і публіцыстыцы адносна нядаўна, атрымаў сваё распаўсюджванне ў беларускай гістарыяграфіі з канца 1980-х гг. [8].

Беларусы Літвы – насельніцва Літоўскай Рэспублікі, якое мае беларускія карані, і насельніцтва, якое адносіць сябе да беларускага этнасу. Згодна дадзеных перапісу 2011 г. на тэрыторыі Літоўскай рэспублікі пражывала 36 227 беларусаў [12].

PolotskSU



Тэрыторыя даследавання – межы сучаснай Літоўскай дзяржавы. Крыніцай даследавання сталі этнаграфічныя матэрыялы, якія былі сабраны аўтарам падчас сустрэч з беларусамі Літвы на працягу 2015 – 2017 гг. на тэрыторыі Літоўскай рэспублікі. Рэспандэнты прадстаўляюць тры пакаленні жыхароў сучаснай Літоўскай дзяржавы: аўтахтоннае насельніцтва (якое нарадзілася на тэрыторыі сучаснай Літвы); насельніцтва, якое пераехала ў пасляваенны перыяд; - другое/трэцяе пакаленне беларусаў, якія нарадзіліся ў Літоўскай рэспубліцы.

На ідэнтыфікацыю чалавека з той альбо іншай нацыяй уплываюць розныя фактары. Па-першае, палітыка дзяржавы ў якой пражывае чалавек і з якой сябе атаясамлівае. Па-другое, працэсы ўрбанізацыі і глабалізацыі. Па-трэцяе, рэлігійны фактар. З улікам вышэйпералічаных умоў неабходна разглядаць ідэнтычнасць беларускай супольнасці ў Літве.

Захаванне этнічнай культуры з’яўляецца галоўнай прыкметай дыяспары. Аднак па сканчэнню нейкага часу, этнічная культура дыяспары ўжо зніжае ідэнтычнасць культуры этнаса. На яе накладвае адбітак культуры інаэтнічнага асяроддзя, а ў выніку магчымасць сувязі з мацярынскім этнасам страчваецца пераемнасць культурных традыцый. Сітуацыя ўскладняецца цяжкасцю захавання этнічнай культуры ва ўрбанізаваным асяродку, дзе распаўсюджаны стандартызаваныя эталоны матэрыяльнай і духоўнай культуры.

Можна канстатаваць, што хоць развіццё глабалізацыі не прыводзіць да сцірання этнічных адрозненняў, але этнічная ідэнтычнасць, як форма групавой ідэі перажывае сур’ёзныя змены, як у бок гіпербалізацыі (этнацэнтрызм, этнадамінаванне, этнафанатызм, нацыяналізм), так і змяншэння (этнанегатывізм, этнаэлімінацыя, этнанігілізм). Гэты стан галоўным чынам выступае ахоўнай рэакцыяй, пратэстам супраць нацыянальнага нераўнапраўя ці выкліканы страхам этназамены.

Вялікі ўплыў на этнічную ідэнтычнасць беларусаў Літвы аказваюць працэсы фарміравання беларускай нацыянальнай ідэнтычнасці на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь. Сярод асаблівасцей генэзіса нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці беларусаў Т.В. Каравай вылучае наступныя:

- фарміраванне беларускай нацыянальнай ідэнтычнасці адбывалася пад уплывам палітычных, рэлігійных, сацыяльных, эканамічных і этнічных фактараў;
- незавершанасць працэса фарміравання беларускай нацыянальнай ідэнтычнасці і яе дынамічны характар;
- прывязанасць да тэрыторыі, роднага месца – “роднаму куту”, лакальнасць і цесная сувязь чалавека і групы, самаідэнтыфікацыя на аснове фарміравання “тутэйшасці”;
- памежнае становішча беларускіх зямель – “ваганне паміж Захадам і Усходам і шчырая непрыхільнасць ні да аднаго, ні да другога”; здольнасць існаваць у цэнтры палітычнага і культурнага грамадства [7, с. 89].

Уплыў геаграфічных, эканамічных, культурных, палітычных, этнічных, гістарычных фактараў на працэс ідэнтыфікацыі беларусаў дазваляе зрабіць высновы аб складанасці і шматаспектанасці працэса фарміравання нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці беларусаў, што ў сваю чаргу ўскладняе выпрацоўку крытэрыяў беларускай нацыянальнай ідэнтычнасці. Згодна меркаваня даследчыка А. Ціхамірава, “… галоўнымі крытэрыямі ідэнтычнасці беларусаў з’яўляюцца:

PolotskSU



- прымеркаванасць да пэўнай тэрыторыі;
- веравызнанне;
- прыналежнасць да пэўнага сацыяльнага класа;
- каштоўнасныя арыентыры людзей" [9, с. 71].

Усю сукупнасць крытэрыяў этнічнай супольнасці, якія ўзніклі ў выніку гістарычнага развіцця, можна падзяліць на дзве групы: натуральна-прыродныя і сацыякультурныя. Да натуральна-прыроднай групы можна аднесці: "месцаразмяшчэнне" (гістарычная тэрыторыя ўзнікнення і станаўлення, этнасу), біясфера; ландшафт, экасістэма, а таксама, "кроў" (антрапалагічныя рысы). Натуральна-прыродныя дэтэрмінанты з'яўляюцца адпраўной кропкай у пачатку этнічнай гісторыі, бо этнічная супольнасць ўзнікае і існуе на базе асаблівага, выкліканага кліматычнымі і ландшафтнымі ўмовамі і якая ўласціва дадзенай сукупнасці індывідаў спосабу адаптацыі да асяроддзя пражывання; гэта - своеасаблівы ахоўны механізм, "інструмент" адаптацыі які дазваляе выжыць і выпрацаваць аптымальныя формы быцця.

На сучасным этапе ў поліэтнічным асяродку, якім з'яўляецца Літоўская рэспубліка, найбольш спрыяльнай для чалавека становіцца біэтнічная (ці кроскультурная) ідэнтычнасць, аднак яе фармаванне ажыццяўляецца павольна, складана і супярэчліва.

Да сацыякультурных фактараў фарміравання ідэнтычнасці беларусаў Літвы адносіцца беларуская мова. На сучасным этапе беларуская мова ў Літве юрыдычна і фактычна – мова беларускай этнакультурнай групы з абмежаваным характарам, ужываецца пераважна ў паўсядзённым жыцці і ў вуснай форме. Валоданне ёю ці яе вывучэнне тлумачыцца найперш суб'ектыўнымі прычынамі. Тым не менш яна знаходзіць пэўную рэалізацыю на макра- і мікраўзроўнях у літоўскім грамадстве і выглядае наступным чынам: 1) выкарыстанне беларускай літаратурнай мовы ў літаратурнай унармаванай і прастамоўных разнавіднасцях; 2) сфера ўжывання беларускіх дыялектаў на беларуска-літоўскім памежжы; 3) беларускі лінгвістычны ўплыў на маўленне прадстаўнікоў іншых нацыянальных груп [11, с. 226].

У той самы час неабходна адзначыць, што валоданне і выкарыстанне беларускай мовы не з'яўляўляецца поўным крытэрыем ідэнтыфікацыі носьбіта з нацыяй, на мове якой ён размаўляе. Пацвярджэннем з'яўляецца артыкул навукоўца Валерыя Чэкмана, які быў напісаны па выніках мовазнаўчай экспедыцыі 1989 г. тэрыторый, дзе пражываюць палякі. Паводле перапісу насельніцтва 1989 г. у Літве пражывае 258 тыс. палякаў, што складае 7% ад усёй колькасці насельніцтва. У Вільні пражывае 108 тыс. палякаў, астатнія ў Салечніцкім раёне (каля 80% жыхароў), Віленскім раёне (60,5%), Троцкім (каля 24%), Свяньцянскім (каля 30%), Шырвінцкім (11%), Малецкім (10%) і колькі іншых.

В. Чэкман звяртае ў сваёй працы ўвагу на "Этнаграфічную мапу беларускага племені" Я. Карскага, што была апублікавана ў 1903 г., на якой уся Паўднёва-усходняя Літва, была трактавана як чыста беларускамоўная тэрыторыя. Ва ўсім Салечніцкім раёне, "паўднёвай, падвіленскай", частцы Віленскага раёну і ўсходняй частцы Троцкага раёну мовай мясцовага насельніцтва з̓ яўляецца "простая мова". "Мы ёсць палякі, але мы размаўляем па-просту!" [10, с. 6]. З моўнага пункту гледжання "простая мова" – гэта звычайны заходнебеларускі дыялект.

PolotskSU



У сваёй працы аўтар разглядае пытанні "простай мовы" (беларускай) і суадносін выкарыстання беларускай, польскай і літоўскай моў польскім насельніцтвам Літвы. Даледчык звяртае ўвагу на тое, што ўсё беларускамоўныя палякі лічаць польскую мову за культурную і прэстыжную. З чужымі людзьмі стараюцца заўсёды размаўляць па-польску. На пытанне, якую мову беларускамоўныя палякі лічаць за сваю родную (нават, тыя якія размаўляюць выключна па-беларуску) без развагаў абіраюць польскую, толькі адзінкі назвалі роднай мовай "простую", ніхто з апытаных не называе яе беларускай [10, с. 6].

Фарміраванне беларускай мовы ў адрыве ад асноўнага этнасоцыуму ў лакальных рэаліях і выкліканае сацыяльнымі характарыстыкамі, узроўнем адукацыі, месцам жыхарства і ўзростам рэспандэнтаў нароўні з іншымі мовамі актыўна фарміруе моўную карціну Літвы.

Агульнасць мовы – адна з самых істотных прыкмет нацыі. Як важнейшы сродак чалавечых зносін яна ўдзельнічае ў працэсе ўтварэння на пэўнай тэрыторыі супольнасці эканамічнага жыцця і псіхічнага складу людзей, з'яўляецца асновай развіцця ўсіх галін нацыянальнай культуры і фарміравання нацыянальнай самасвядомасці.

Аналізуючы палявы матэрыял неабходна адзначыць, што мова з'яўляецца адным з крытэрыяў нацыянальнай ідэнтычнасці. У адносінах беларусаў Літвы неабходна адрозніваць з аднаго боку валоданне мовай і яе выкарыстанне, а з другога – лінгвістычную ідэнтычнасць: калі першае пастуюова губляе сваю моц, то другое амаль поўнасцю захавана.

Рэлігія з'яўляецца адным з найважнейшых кампанентаў культуры. Яна шмат у чым вызначае асноўныя контуры этнічнай культуры і адыгрывае вялікую ролю ў гісторыі беларускай этнічнай супольнасці ў Літве. Рэлігійная ідэнтычнасць асобы з'яўляецца шматкампанентнай з'явай, значны ўплыў на яе фарміраванне аказвае палітыка дзяржавы. Так, напрыклад, асноўным зместам польскай рэлігійнай палітыкі на "ўсходніх крэсах" у міжваенны перыяд з'яўлялася ўцягванне беларускага насельніцтва ў сферу ўплыву каталіцкай царквы і польскай дзяржавы.

У савецкі час рэлігійнае пытанне мела другаснае значэнне. Але ў адрозненне ад Беларускай ССР, на тэрыторыі Літоўскай ССР працавалі цэрквы і касцёлы, якія наведвалі не толькі жыхары Літвы, але і беларускае насельніцтва з памежных тэрыторый [3]. З актывізацыяй нацыянальнага руху ў другой палове 1980-х гг. канфесійнае жыццё атрымлівае іншы імпульс: па ініцыятыве беларусаў-віленчукоў ў апошнім дзесяцігоддзі XX ст. беларуская этнічная супольнасць мела магчымасць маліцца па-беларуску ў касцёле і царкве, ініцыятарам правядзення малебнаў па-беларуску ў апошняй быў святар Васіль Навінскі. Беларусам быў перададзены храм св. Мікалая ў цэнтры Вільні, але па-розных прычынах беларускім ён быў нядоўгі перыяд часу. Згодна слоў святара Васілія Мікалаеўскай царквы: "Не было зацікаўленасці саміх беларусаў, таму мы перайшлі на рускую мову, якая зразумелая для ўсіх: і рускіх, і беларусаў" [3].

Згодна даных перапісу 2011 г. на тэрыторыі Літоўскай Рэспублікі каталіцкае насельніцтва складае 47 % ад усёй колькасці беларускай этнічнай групы, праваслаўнае - 32 %, прадстаўнікі іншых канфесій – 24 % [12].

Жыццё каталіцкага беларускага касцёлу на першым этапе было актыўным: беларусы атрымалі касцёл, святара, які маліўся па-беларуску. Але пазней касцёл быў перададзены каталікам-палякам. Новае жыццё атрымаў беларускі каталіцкі касцёл у 2016 г.:

PolotskSU



дзякуючы намаганням беларусаў-віленчукоў быў перададзены беларускай этнічнай супольнасці касцёл Св. Барталамея – адзіны касцёл на тэрыторыі Літоўскай рэспублікі, у якім малебны праходзяць на беларускай мове [5].

У накірунку кансалідацыі беларусаў Літвы касцёл з'яўляецца ў пэўнай ступені першым крокам у рэлігійным аб'яднанні. Са слоў ксяндза Арыуша Малыска: "Патрэбна перадусім, каб людзі прывыклі, што беларускае душпастарства ёсць, калі яно не залежнае ад дыяцэзіі. Патрэбен час, каб людзі маглі прыйсці. Царква, касцёл – супольнасць, калі чалавек бачыць за гэтым будынак, то гэта няправільна" [3].

Сястра Алена звяртае ўвагу на тое, што сёння маленькія дзеткі не ведаюць мовы, ім цяжка размаўляць, але на занятках пакрысе дзеці далучаюцца да рэлігіі на беларускай мове. Гэта працэс складаны і доўгі. Але вось вочкі, якія гараць агенчыкам цікаўнасці – самае вялікае шчасце. "Штотыдзень я праводжу заняткі для дзяцей у беларускай гімназіі, а па нядзелях мы займаемся ў касцёле. І прыемна, што колькасць дзетак павялічваецца" [3].

20 жніўня 2017 г. прайшлі адпустовыя ўрачыстасці ў беларускай парафіі Св. Барталамея ў Вільні адбыліся. Святую Імшу з гэтай нагоды ўзначаліў дапаможны біскуп Мінска-Магілёўскай архідыяцэзіі Аляксандр Яшэўскі [1].

Касцёл св. Барталамея ў Вільні з'яўляецца адзіным касцёлам, у якім малебны адбываюцца на беларускай мове. На тэрыторыі астатняй Літвы – на польскай альбо літоўскай мовах. Так, згодна слоў рэспандэнта: "Мы палякі беларускага паходжання. Нарадзіліся на Беларусі – ў Воранаўскім раёне – у савецкі час пераехалі ў Літву, але мы палякі. Ходзім да касцёлу" [3]. "У нас [г. Паневежыс] у касцёле моляцца па-літоўску. У горадзе ёсць царква праваслаўная – па-руску, а вот у касцёле па-літоўску" [3]. Канфесійны фактар ў фарміраванні этнічнай ідэнтычнасці знаходзіцца пад уплывам іншых нацыянальнасцей.

У пытанні захавання духоўнай культуры неабходна вылучыць два ўзроўні. Першы – сямейныя традыцыі [2]. Другі – рэпрэзентацыя і захаванне беларускімі арганізацыямі і аб'яднаннямі [3].

Фарміраванне, падтрыманне і захаванне этнічнай ідэнтычнасці забяспечваецца скаардынаванымі сумеснымі дзеяннямі сям'і, школы і інш. навучальных устаноў, сродкаў масавай інфармацыі і іншых сацыяльных інстытутаў, дзейнасць якіх павінна насіць планамерны і скаардынаваны характар, каб у выніку этнічная ідэнтычнасць насіла характар пазітыўнай монаідэнтычнасці або развітай біэтнічнай ідэнтычнасці.

Другой ступенню фарміравання этнічнай ідэнтычнасці з'яўляецца школа. На тэрыторыі Літоўскай Рэспублікі ў Вільні з 1993 г. дзейнічае беларуская сярэдняя школа імя Францыска Скарыны [6, с. 68], якая з'яўляецца цэнтрам беларускай культуры. Але гэтая беларуская школа – адзіная на тэрыторыі Літоўскай рэспублікі. У некаторых гарадах Літвы працуюць нядзельныя беларускія школы, дзе займаюцца дзеткі адзін раз на тыдзень (звычайна нядзеля), знаёмяцца з беларускімі традыцыямі, культурай [3]. У той самы момант неабходна адзначыць на сённяшні дзень невялікую папулярнасць гэтых школ сярод беларусаў Літвы. Адной з прычын з'яўляецца старэнне беларускай дыяспары ў Літве. Справа ў тым, што актывістамі нацыянальнага ўздыму ў 1980–90 гг. у большасці былі людзі ва ўзросце 20–80 гадоў. Прайшло некалькі дзясяткаў гадоў – моладзь, якая нарадзілася ў Літве ў гэты перыяд далучаецца да працэсу глабалізацыі: выязджае вучыцца і працаваць

PolotskSU



за межы Літвы, а людзі, якія прыязджаюць з Беларусі з мэтай навучання, працы – не праяўляюць сваёй актыўнасці. Аднаўленне беларускіх суполак практычна не адбываецца і ў выніку колькасць беларусаў у Літве зніжаецца.

Важнае месца ў фарміраванні этнічнай ідэнтычнасці беларусаў Літвы займаюць ВНУ, якія захоўваюць беларускую культуру, - Віленскі універсітэт, Цэнтр беларускай мовы, літаратуры і этнакультуры Літоўскага ўніверсітэта эдукалогіі і Еўрапейскі гуманітарны універсітэт. У моладзевым асяродку фарміруюцца новыя погляды на беларускую культуры і яе рэпрэзентацыю.

Сацыяльнымі інстытутамі, якія ўплываюць на фарміраванне этнічнай ідэнтычнасці, з'яўляюцца беларускія суполкі, адной з функцыяй якіх з'яўляецца іх актыўны ўдзел у падтрыманні, развіцці і ўмацаванні культуры свайго народа, у культываванні нацыянальных традыцый і звычаяў, у падтрыманні культурных сувязей са сваёй радзімай [6, с. 68]. Традыцыйным стала для беларусаў Літвы "Свята беларускай песні", якое адбываецца штогод у розных гарадах літоўскай дзяржавы.

Працэс самаарганізацыі і самакіравання з'яўляецца вызначальным фактарам у функцыянаванні дыяспар. Агульнымі началамі самаарганізацыі для любой дыяспары з'яўляецца пражыванне па-за межамі страны паходжання, агульныя этнічныя карані і духоўныя каштоўнасці. Не кожная дыяспара валодае эфектыўнымі механізмамі самаарганізацыі і самакіравання, так пры наяўнасці кансалідуючых фактараў у межах дыяспары этнічная меншасць можа заставацца дыскрэтнай. Такім чынам, яшчэ адной праблемай фарміравання этнічнай ідэнтычнасці беларусаў Літвы з'яўляецца дыяспары падзел на дзве часткі.

Асаблівасцю захавання і рэпрэзентацыі беларускай культуры ў Літве з'яўляецца яе адраджэнне сімвальнай элітай у гарадскім асяроддзі. У сельскай мясцовасці колькасць беларусаў, якія сябе адносяць да беларускай нацыі, нязначная. Тлумачыцца гэта некалькімі прычынамі. Па-першае, адсутнасцю сувязі пакаленняў, калі частка беларусаў у пасляваенны час была рэпрасавана. Па-другое, аддаленасцю ад гарадскіх цэнтраў, дзе пытаннямі адраджэння і захавання займаюцца беларускія арганізацыі. Па-трэцяе, рэлігійны фактар, калі часам у адпаведнасці з прыналежнасцю да пэўнай канфесіі чалавек адносіць сябе да той альбо іншай нацыі. Неабходна ўлічваць, што ўплыў і аўтарытэт мясцовай царкоўнай іерархіі для вясковага насельніцтва больш значны, чым расповеды "незнаёмцаў" пра беларускую культуру. У дадзеным накірунку спрацоўвае механізм падзелу "свой – чужы".

За апошняе дзесяцігоддзе ў сістэме сродкаў масавай інфармацыі (далей СМІ) адбыліся значныя змены, звязаныя са зменамі ў сацыяльна-палітычнай структуры грамадства, з укараненнем новых тэхналогій, большай інтэграцыяй СМІ, у адрозненне ад папярэдніх ім савецкіх, партыйных сродкаў масавай інфармацыі і прапаганды, у еўрапейскі рынак. Адсюль з'яўленне мноства тыпалагічна новых выданняў. Частка з іх запазычаная з заходніх мадэляў, іншая з'яўляецца адраджэннем гістарычных традыцый дарэвалюцыйнай пары ў сферы газетна-часопіснай справы. За апошнія дзесяць гадоў рэзка вырас інфармацыйны кампанент СМІ, але найважнейшай часткай нашай журналістыкі застаюцца аналітыка, інтэрпрэтацыя падзей, публіцыстыка.

Асаблівасцю СМІ беларусаў Літвы з'яўляецца іх стварэнне і аднаўленне інтэлігентамі-беларусамі. Газета "Рунь" выходзіць штомесяц [2]. На яе старонках адлюстравана

PolotskSU



жыццё беларускай этнічнай супольнасці Літвы. Пастаяннымі рубрыкамі газеты з'яўляюцца: "Люстрадзён" адлюстроўвае жыццё і дзейнасць беларускіх суполак, згуртаванняў, арганізацяў у Літве, якіх тут налічваецца больш за 20. "Балтыцкі хранограф" асвятляе найбольш значныя грамадзка-палітычныя, культурныя падзеі за месяц у балтыцкім рэгіёне. Тут друкуюцца аналітычныя артыкулы. "Беларускі сьвет" складаецца пераважна з лістоў, допісаў, цікавых і яркіх фрагмэнтаў дасыланых нашымі чытачамі з Літвы, Беларусі і ўсяго астатняга беларускага свету. "Постаці" – гэта рубрыка прысвечана як вядомым, гэтак і малавядомым дзеячам на палітычнай, грамадзкай, культурнай, мастацкай, літаратурнай беларускай ніве з далёкай і блізкай мінуўшчыны. "Успаміны" паўсталі з таго факту, што за час існавання газеты ў архіве рэдакцыі назапасілася багата матэрыялаў мемуарнага плану, запісаў, рэдкіх фатаздымкаў, нідзе недрукаваных літаратурных твораў. "Літаратура" – літаратарная старонка, дзе друкуюцца кароткія звесткі пра творчасьь вядомых беларускіх пісьменьнікаў і іх творы, часта нідзе раней не друкаваныя. "Дзівосы Беларусі" распавядаюць чытачам пра прыродныя помнікі, цікавыя прыродныя з'явы, унікальны раслінны і жывёльны свет Беларусі і Літвы.

Але ў той самы момант на сённяшні дзень газета з'яўляецца адзінай беларускамоўнай газетай на тэрыторыі Літоўскай рэспублікі. Вялікі інфарматыўны ўплыў маюць руска- і польскамоўныя сродкі масавай інфармацыі: газеты і тэлевізійныя перадачы, асабліва апошнія, якія транслюцца на прамую з Расіі. У сваю чаргу беларускія каналы глядзіць невялікая колькасць людзей з-за іх невялікай зоны распаўсюджвання на тэрыторыі Літоўскай дзяржавы – гэта першае. Другое, працэс фарміравання ідэнтычнасці мае ўмоўна рацыянальны характар і ў большай ступені дэтэрміраваны не кагнетыўнымі, а эмацыянальнымі механізмамі, захоўваецца "савецкая ментальнасць" з яе арыентацыяй на дзяржаўнае патраніраванне і "заходнія" сістэмы каардынат з індывідуалістычнай дамінантай [4, с. 99]. Для больш маладога пакалення інфарматыўнай з'яўляецца інтэрнэт-прастора, якая ўтрымлівае звесткі рознага кшалту.

Такім чынам, полікультурнае існаванне розных народаў на адной і той тэрыторыі ставіць перад кожным з іх, з аднаго боку, праблему захавання сваёй этнічнай самабытнасці, а, з другога, праблемы адаптацыі і інтэграцыі ў іншамоўным асяроддзі. Нацыянальнае "я" нават у самых спрыяльных умовах не можа захавацца і функцынаваць у такім жа аб'ёме, як на тэрыторыі метраполіі. З гэтага вынікае, што ў першую чаргу патрэбна развіваць тыя элементы, якія дамінуюць у фарміраванні нацыянальанй свядомасці і захаванні этнічнай супольнасці беларусаў.

Этнічную ідэнтычнасць неабходна разумець як дынамічны працэс, які можа падвяргацца шматлікім трансфармацыям. Ацэньваючы сучасны стан і галоўныя тэндэнцыі ў развіцці этнічнай ідэнтычнасці беларусаў Літвы, аўтар падкрэслівае, што ў эпоху глабалізацыі "ідэнтычнасць" з'яўляецца прадметам выбару, характарызуецца зменлівасцю, рухомасцю, множнасцю. Разам з тым гэты "выбар" не зусім вольны, бо ажыццяўляецца ў пэўным сацыяльным кантэксце, дзе зададзены не толькі спектр альтэрнатыў, але і набор розных сацыяльных практык.

ЛІТАРАТУРА

1. Адамковіч, А. Беларусы-католікі ў Вільні адзначылі парафіяльнае свята [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://catholic.by/3/news/belarus/6371-belarusy-katoliki-vilni-adznachyli-parafiyalnae-svyata. – Дата доступу: 20.08.2017.

PolotskSU



2. АІМЭФ. – Ф. 6. Воп. 14. Спр. 226.
3. АІМЭФ. – Ф. 6. Воп. 14. Спр. 232.
4. Белявцев, Д.В. Политическая идентичность Беларуси: поиски в ситуации пограничья / Д.В. Белявцев // Веснік Беларускага эканамічнага універсітэта. – 1994. – С. 95–104.
5. Запрашаем на беларускія набажэнствы ў Вільні [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://westki.info/tbk/20435/zaprashaem-na-belaruskiya-nabazhenstvy-u-vilni, вольны. – Дата доступу: 23.03.2016.
6. Изергина, Е. Белорусы Литвы: история формирования этнической группы и современность / Е. Изергина // Наука и инновации. – 2016. – № 12. – С. 66–69.
7. Каравай, Т.В. Национально-культурная идентичность / Т.В. Каравай // Вести Института современных знаний. – 1999. – С. 87–91.
8. Коваль, В. Кантакты беларускай і украінскай дыяспар міжваеннага перыяду [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://docviewer.yandex.by/?url=ya-serp%3A%2F%2Fpdf.kamunikat.org%2F13178-10.pdf&lang=be&c=55606669feb7, вольны. – Дата доступу: 03.05.2015.
9. Тихомиров, А. К вопросу о критериях идентичности белорусов / А. Тихомиров // Журнал международного права и международных отношений. – 2011. – № 2. – С. 71–72.
10. Чэкман, В. Над этнічнай і моўнай мапай палякаў Літвы / В. Чэкман // Рунь. – 1996. – № 4. – С. 6.
11. Kalba ir tarpkultūririe komunikacija / redakcine kolegija: L. Plygavka. – Vilnius : Vilniaus pedagoginio universiteto leidykla, 2009. – 190 с.
12. Population by ethnicity | Statistics Lithuania [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://pop-stat.mashke.org/lithuania-ethnic2011.htm.

## THE QUESTION OF ETHNIC IDENTITY OF THE BELARUSIAN COMMUNITY ON THE EXAMPLE OF SPIRITUAL CULTURE

*A. IZERHYINA*

*Ethnic identity is a dynamic process that can undergo many transformations. The author comes to the conclusion that in the era of globalization, the "identity" and the main tendencies of the ethnic identity development of the Belarusians in Lithuania are the subject of choice, characterized by variability, mobility, and multiplicity.According to the field data collected by the author during 2015–2017 on the territory of the Republic of Lithuania, the author has come to the conclusion that although the development of globalization does not lead to the erasure of ethnic differences, the ethnic identity as a form of group idea undergoes serious changes to both hyperbolization and reduction. The ethnic and national ideology, preservation and development of the images of the past by the creative elite have contributed to the consolidation of the Belarusian society and the formation of the ethnic identity on different levels.*